# No. 45224*

# Romania
# and
# Belarus

**Agreement between Romania and the Republic of Belarus on friendly relations and cooperation. Bucharest, 7 May 1993**

**Entry into force:** *22 April 1994 by the exchange of instruments of ratification, in accordance with article 22*

**Authentic texts:** *Belarusian and Romanian*

**Registration with the Secretariat of the United Nations:** *Romania, 8 September 2008*

**The texts reproduced below are the original texts of the agreement as submitted. For ease of reference, they were sequentially paginated. The relevant Treaty Series volume will be published in due course.*

# Roumanie
# et
# Bélarus

**Accord d'amitié et de coopération entre la Roumanie et la République du Bélarus. Bucarest, 7 mai 1993**

**Entrée en vigueur :** *22 avril 1994 par échange des instruments de ratification, conformément à l'article 22*

**Textes authentiques :** *biélorusse et roumain*

**Enregistrement auprès du Secrétariat des Nations Unies :** *Roumanie, 8 septembre 2008*

**Les textes reproduit ci-dessous sont les textes authentiques de l'accord tel que soumises pour l'enregistrement. Pour référence, ils ont été présentés sous forme de la pagination consécutive. Le volume correspondant du Recueil des Traités sera disponible en temps utile.*

[ BELARUSIAN TEXT – TEXTE BIÉLORUSSE ]

# ДАГАВОР

## паміж Румыніяй і Рэспублікай Беларусь аб дружалюбных адносінах і супрацоўніцтве

Румынія і Рэспубліка Беларусь, якія далей называюцца "Дагаворныя Бакі",

кіруючыся мэтамі і прынцыпамі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый,

грунтуючыся на палажэннях Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, Парыжскай хартыі для новай Еўропы, а таксама іншых дакументаў Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе,

выходзячы з прымату права ў міжнародных адносінах,

усведамляючы сваю адказнасць за ўмацаванне міру і бяспекі і развіццё супрацоўніцтва ў Еўропе на аснове агульначалавечых каштоўнасцей свабоды, дэмакратыі, павагі правоў чалавека і асноўных свабод,

беручы пад увагу значэнне дружалюбных румынска-беларускіх адносін для ўмацавання давер'я і супрацоўніцтва на еўрапейскім кантыненце і, у прыватнасці, у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе,

падрэсліваючы рашучасць абедзвюх Дзяржаў унесці свой уклад у развіццё працэсу Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, у стварэнне адзінай еўрапейскай эканамічнай, палітычнай, гуманітарнай, экалагічнай і прававой прасторы,

імкнучыся садзейнічаць развіццю ўзаемавыгаднага двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама паглыбленню ўзаемаразумення паміж румынскім і беларускім народамі,

дамовіліся аб ніжэйпададзеным:

Артыкул 1

1. Дагаворныя Бакі будуць развіваць паміж сабой адносіны ў духе дружбы, супрацоўніцтва і ўзаемнай павагі, кіруючыся прынцыпамі Статута Арганізацыі Аб"яднаных Нацый, Хельсінкскага Заключнага акта і іншых дакументаў Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, а таксама іншымі агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права.

2. Дагаворныя Бакі пацвярджаюць, што ўсе народы маюць права ва ўмовах поўнай свабоды вызначаць свой унутраны і знешні палітычны статус без умяшання звонку і ажыццяўляць паводле свайго меркавання сваё палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.

Артыкул 2

1. Дагаворныя Бакі будуць дзейнічаць у напрамку пераўтварэння Еўропы ў супольнасць дзяржаў, якая з"яўлялася б прасторай трывалага міру, права і дэмакратыі. З гэтай мэтай яны абавязваюцца ўмацоўваць еўрапейскія механізмы забеспячэння бяспекі, стабільнасці і супрацоўніцтва на аснове Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, Парыжскай хартыі для новай Еўропы, іншых дакументаў Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, а таксама Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе.

2. Дагаворныя Бакі прызнаюць уклад, які могуць унесці ва ўмацаванне бяспекі і развіццё супрацоўніцтва на кантыненце існуючыя міжурадавыя арганізацыі, і будуць развіваць з імі самае шырокае супрацоўніцтва.

Артыкул 3

Дагаворныя Бакі пацвярджаюць недапушчальнасць выкарыстання сілы або пагрозы сілай у міжнародных адносінах, накіраваных супраць тэрытарыяльнай цэласнасці і палітычнай незалежнасці любой дзяржавы, а таксама якім-небудзь іншым чынам несумяшчальных з мэтамі і прынцыпамі Статута Арганізацыі Аб"яднаных

Нацый і Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Артыкул 4

Дагаворныя Бакі прызнаюць неабходнасць мірнага ўрэгулявання спрэчак у адпаведнасці са Статутам Арганізацыі Аб"яднаных Нацый і будуць актыўна падтрымліваць адпаведныя механізмы Арганізацыі Аб"яднаных Нацый і Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе па прадухіленню і спыненню канфліктаў.

Артыкул 5

Дагаворныя Бакі будуць садзейнічаць прадаўжэнню працэсу раззбраення ў галіне ядзерных, хімічных і іншых відаў зброі масавага знішчэння і звычайных узбраенняў. Яны будуць таксама садзейнічаць далейшаму скарачэнню ўзброеных сіл і ўзбраенняў у Еўропе і ажыццяўляць меры па ўмацаванню давер"я і бяспекі ў ваеннай галіне.

Артыкул 6

Дагаворныя Бакі будуць супрацоўнічаць у сферы прадухілення распаўсюджвання ядзернай і іншых відаў зброі масавага знішчэння. Яны будуць узаемадзейнічаць у мэтах ажыццяўлення кантролю над экспартам тавараў і тэхналогій, якія служаць мірным мэтам, але могуць быць выкарыстаны для вытворчасці зброі масавага знішчэння.

Артыкул 7

1. У выпадку ўзнікнення сітуацыі, якая, на думку аднаго з Дагаворных Бакоў, парушае інтарэсы яго бяспекі або стварае сур"ёзную пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы, ён можа звярнуцца да другога Дагаворнага Боку з тым, каб неадкладна пачаць кансультацыі аб магчымых дзеяннях па пераадоленню такой сітуацыі і яе ўрэгуляванню.

2. Калі адзін з Дагаворных Бакоў стане аб"ектам акта аг-

рэсіі, то другі Дагаворны Бок не будзе аказваць ніякай падтрымкі агрэсару і будзе садзейнічаць спыненню канфлікту з выкарыстаннем працэдур і механізмаў мірнага ўрэгулявання спрэчак у рамках Арганізацыі Аб"яднаных Нацый і Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Артыкул 8

1. Дагаворныя Бакі будуць ажыццяўляць рэгулярныя кантакты паміж дзяржаўнымі органамі на ўсіх узроўнях. Яны надаюць асаблівае значэнне ўзаемным міжпарламенцкім сувязям.

2. Дагаворныя Бакі будуць праводзіць кансультацыі па пытаннях двухбаковых адносін, а таксама па міжнародных пытаннях, якія ўяўляюць інтарэс для абедзвюх Дзяржаў, і ў прыватнасці, па пытаннях бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе.

Артыкул 9

1. Дагаворныя Бакі будуць развіваць і дыверсіфікаваць двухбаковыя эканамічныя адносіны, заснаваныя на прынцыпах роўнасці, партнёрства і ўзаемнай выгады.

2. Дагаворныя Бакі будуць дзейнічаць у напрамку стварэння перадумоў для пабудовы адзінай еўрапейскай эканамічнай прасторы, заснаванай на аптымальным эканамічным развіцці кожнай дзяржавы і пашырэнні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва на кантыненце.

Артыкул 10

1. Дагаворныя Бакі будуць заахвочваць пашырэнне ўзаемных гандлёвых абменаў і будуць ствараць спрыяльныя ўмовы для развіцця сучасных форм прамысловага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з мэтай эфектыўнага выкарыстання матэрыяльных і людскіх рэсурсаў.

2. Дагаворныя Бакі будуць развіваць і ўдасканальваць прававую аснову двухбаковага эканамічнага супрацоўніцтва, уключа-